4. Открытие в г. Витебске образцовой женской церковно-приходской школы при Полоцком женском училище духовного ведомства // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1889. – № 21. – С. 905–914.
5. Открытие начальной школы при Виленском женском училище духовного ведомства 28 сего января // Литовские епархиальные ведомости. – 1897. – № 5. – С. 37–38.
6. Пороменский, П. Паричское женское св. Марии Магдалины училище духовного ведомства (Заметка по случаю 50-летнего юбилея училища). – СПб.: синодальная типография, 1910. – 136 с.
7. Отчет о состоянии полоцкого Спасо-Евфросиньевского епархиального женского училища в учебно-воспитательном отношении за 1912–1913 учебный год // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1914. – № 13. – С. 163–173; № 14–15. – С. 176–188; № 16. – С. 198–202; № 17. – С. 208–213; № 18. – С. 221.
8. Всеподданнейший отчёт обер-прокурора Святейшего Синода по ведомству православного исповедания за 1914 год. – Петроград: Синодальная типография, 1916. – 328 с.
9. Десятилетие церковно-приходской школы // Минские епархиальные ведомости. – 1894. – № 16. – С. 415–420.
10. Канфесіі на Беларусі (кан. XVIII – XX ст.ст.) / В.В. Грыгор'ева, У.М Завальнюк, У.І. Навіцкі, А.М. Філатава; навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 1998. – 340 с.
11. Результаты школьной переписи // Народное образование в Виленском учебном округе. – 1911. – № 7–8. – С. 603–607.

## ВОПЫТ РЭЛІГІЙНАЙ АДУКАЦЫІ ТАТАРСКА–МУСУЛЬМАНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ

Грыбава С.У., ст. выкладач, БрДТУ

Як вядома, татары Беларусі вызнаюць іслам, а паводле дадзенай рэлігіі кожны мусульманін павінен умець чытаць святыя кнігі Кур'ан і Хамаіл, напісаныя, зразумела, на арабскай мове.

Невядомы аўтар у лісце да Султана ў 1558 годзе пісаў аб тым, што татары на беларускіх землях ў той час ужо не маглі размаўляць па–турэцку і арабску, а выкарыстоўвалі беларускую ці польскую мовы [1, с. 24]. Такім чынам, прыкладна з сярэдзіны XVI ст. беларускімі татарамі як мова зносін ужывалася мова мясцовая. Гэта было вынікам матэрыяльнага ўвасаблення тых сацыяльна–культурных змен у іх свядомасці, якія пачаліся фактычна з моманту іх перасялення на новыя землі, калі ўзнікла неабходнасць камунікацыі з тутэйшым славянскім насельніцтвам. Такім чынам, для таго каб чытаць святыя кнігі, неабходна было вучыцца. Калі бацькі не спрыялі навучанню сваіх дзяцей арабскай пісьменнасці, гэта лічылася вялікім грахом.

Вучылі чытаць арабскія тэксты і пісаць арабскім алфавітам у спецыяльных школах – мектэбэ, якія ў татарскіх паселішчах існавалі з даўніх часоў. Аб іх успамінаў аўтар «Рысале» у 1558 годзе, скардзячыся адначасова на адсутнасць сярэдніх і вышэйшых тэалагічных школ, што



Репозиторий БрГТУ

меліся пры мячэцях ва ўсім ісламскім свеце. «Пры вялікіх мячэцях, – пісаў ён, – звычайна трымалі імамаў з Крыма і Арды, аплачваючы іх уласнымі сіламі, у іх жа вучацца нашыя дзеці, з іх некаторыя рыхтуюцца да духоўнага прызвання. Калі б не вялікія адлегласці, можна не сумнявацца, што асманскія падзішахі прыслалі б да нас сваіх улемаў (вучоных), якія б трымалі нашу веру ў чысціні і вялі б нас сваёй навукай правільным шляхам» [2, с. 175]. У часы праўлення Стэфана Баторыя здольных вучняў накіроўвалі для далейшага навучання ў арабскія школы, аб чым паведамляў пасланнік Папы Рымскага езуіт Пасевіна ў 1579–1581 гадах у мемарыяле аб становішчы і патрэбнасцях Віленскай парафіі [2, с. 176].

У наступныя гады школы па вывучэнні Кур'ана былі ў кожным вялікім паселішчы татар. Вучыў дзяцей ці сам кіраўнік парафіі – мула, ці яго памочнік – муэдзін, ці спецыяльна прызначаная для таго асоба – годжый (ад турэцкага «хаджа–пан» – настаўнік), або запрашалі паважаных добра-падрыхтаваных старых людзей. Функцыю годжыя ў асноўным выконвалі мужчыны, аднак сярод іх былі і жанчыны – гаджыні (у Ляхавічах, Сандыкаўшчызне, Смілавічах, Навагрудку). Адукацыйны працэс адбываўся ці ў хаце настаўніка, ці ў спецыяльна прызначаным будынку, які ўтрымліваўся на сродкі абшчыны. У невялікіх паселішчах, дзе жыло мала мусульман і не збіралася неабходнай колькасці (5–10) дзяцей для школы, бацькі наймалі настаўніка–мусульманіна непасрэдна для свайго дзіця.

У мусульманскую школу дзеці ішлі з 6–8 гадоў [3, с. 73]. Пачатак заняткаў з'яўляўся значнай і радаснай падзеяй у мусульманскай сям'і, таму напярэдадні гэтага раздавалі садагу (печыва, цукеркі, садавіна). Звычайна заняткі адбываліся ў нядзелю, але маглі быць і часцей.

Годжый у школах найперш знаёміў з арабскім пісьмом. Калі дзеці засвойвалі напісанне літар і вымаўленне асобных гукаў, яны пачыналі чытаць Кур'ан, падзелены дзеля практычнасці на 30 кніжак (кожная па–арабску называецца суфра). Чытанне ішло адразу вельмі марудна, дзеці з цяжкасцю вымаўлялі асобныя аяты, пачынаючы ад першай суфры. Вучань, які па літарах чытаў Кур'ан, зваўся біскіч (з турэцкага – лесвіца). Затым дзеці асвойвалі сюрэем (ад турэцкага «сюратле» – вельмі хутка, жыва), гэта значыць чыталі гладка, без прыпынку. Нарэшце пачыналі спяваць Кур'ан у адпаведнасці з пэўнымі правіламі. Той, хто прачытаў і прапеў яго да суры «Я–Сін», атрымоўваў арабскае прозвішча шахір (знакаміты). Урэшце рэшт, вучань, які, такім чынам, ужо добра пазнаёміўся са Свяшчэннай кнігай, называўся куранджэем. Ён павінен быў праспяваць увесь Кур'ан тры разы з левага і правага боку [2, с. 177–178]. Асвойваць Свяшчэнную кнігу дапамагаў так званы Тэджвід – падручнік, дзе ўтрымліваліся ўказанні, як чытаць Кур'ан. Тэкст дапаможніка быў напісаны на старажытнай турэцкай мове з тлумачэннямі на беларускай альбо польскай мовах. Зразумець тэкст Кур'ана дапамагаў Тэсфір – кніга, у якой акрамя арабскага тэкста Свяшчэннай кнігі змяшчаўся яго пераклад на беларускую ці польскую мовы з тлумачэннямі і каментарыямі. Затым наступала чарга іншых рэлігійных кніг. Такім чынам, вучні, безумоўна, разумелі тое, аб чым чыталі ў рэлігійных кнігах, бо карысталіся перакладамі



Рэпазіторый БрДУ

на вядомую ім мову, а арабскі варыянт малітваў вывучвалі на памяць. Аднак ўвогуле арабскай мовай яны не валодалі.

З прычыны заканчэння вучобы ў школе беларускія татары вельмі ўрачыста адзначалі своеасаблівае свята – Ляхі. Есць звесткі аб тым, што падчас такога свята ў Іўі (суч. Гродзенская вобласць) 15 красавіка 1937 г., арганізаванага ў гонар 14–гадовага Магамета Шабановіча, прысутнічала больш за 150 чалавек. Трэба адзначыць, што ўвогуле ў Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы для традыцыйнай адукацыі татараў–мусульман былі створаны добрыя ўмовы, а для атрымання мусульманскай адукацыі на больш высокім узроўні дзяцей накіроўвалі ў Югаславію, Боснію, дзе яны навучаліся ў медрэсэ – сярэдняй навучальнай установе, якая давала не толькі рэлігійную, але і агульную сярэдную адукацыю. Найбольш здольныя яе вучні далей маглі навучацца ў мусульманскіх вышэйшых навучальных установах у арабскіх краінах [4, с. 11–12]. А вось на тэрыторыі Савецкай Беларусі мусульманскія школы ўвогуле зачыняліся, і ісламская адукацыя прыходзіла ў заняпад. Сваю працу школы змаглі аднавіць толькі ў канцы 80–х гадоў XX ст., калі пачаўся працэс нацыянальна–культурнага адраджэння беларускіх татар.

Пачынаючы з гэтага часу, развіццё ісламскага адукацыі ў Беларусі ўмоўна можна падзяліць на 3 перыяды.

Першы перыяд (1989–1993) – гэта час да стварэння муфціяту – Мусульманскага рэлігійнага аб’яднання ў Рэспубліцы Беларусь. Уся ісламская праца вялася пад эгідай Грамадскага аб’яднання татараў–мусульман «Аль–Кітаб». Пачалі працаваць нядзельныя школы для татарскіх дзяцей у Іўе, Навагрудку, Мінску, Гродна, Слоніме і Смілавічах. Праводзіліся першыя дзіцячыя мусульманскія лагеры ў Стайках. У якасці настаўнікаў ахвотна пагадзіліся выступіць многія студэнты–арабы горада Мінска. За параўнальна кароткі час нядзельныя школы гэтых населеных пунктаў сталі сапраўднымі цэнтрамі набыцця дзецьмі, а часта і дарослымі, ведаў і звычаяў, неабходных для прававернага мусульманіна [5, с. 52]. Аднак іслам выкладаўся імі не ў беларускай татарскай традыцыі, а ў арабскай. Прыўносіліся нярэдка неўласцівыя мясцовым татарам–мусульманам элементы ісламу, звязаныя з яго дамінуючай пазіцыяй адносна іншых рэлігій.

Другі перыяд (1994–1997) звязаны з рэгістрацыяй муфціята Беларусі, які і пачынае кіраваць мусульманскай адукацыяй. Пачатак гэтага перыяду характарызуецца узлётам цікавасці да ісламу. Напрыклад, у мінскай нядзельнай школе дзейнічалі 5 класаў, на занятках прысутнічала каля 50 чалавек.

У гэты час нават з’яўляліся праекты пайсці далей стварэння і дзейнасці традыцыйных нядзельных школ шляхам адкрыцця ў адным з гарадоў Беларусі – Навагрудку альбо Слоніме – медрэсэ з сярэдняй ісламскай адукацыяй для мусульман Беларусі, Польшчы, Літвы, Заходняй Расіі і Паўночнай Украіны. Але гэты праект так і застаўся на паперы.

Другая частка гэтага перыяду адзначаецца спадам цікавасці да ісламу. Пачаліся перабоі ў дзейнасці школ, выявілася недастатковая ўвага да гэтай працы з боку арганізатараў. Акрамя таго, частка вучняў нядзельных школ наведвала іх толькі з мэтай камунікацыі, прадстаўляючы школу не больш як



Рэпазіторый БрДУ

клуб па інтарэсах. Сутыкнуўшыся з вучэбным працэсам, такія людзі пераставалі быць вучнямі.

Трэці перыяд (з 1998 года) – гэта час планамернага і свядомага росту распаўсюджанасці мусульманскай адукацыі. Нядзельныя школы дзейнічаюць у Мінску, Навагрудку, Іўі, Гродна, Смілавічах, Уздзе, Оршы, Клецку, Глыбокім, Маладзечне, а таксама час ад часу – у Ляхавічах, Слоніме, Ашмянах.

Вельмі хутка здабыла папулярнасць сярод татарскай моладзі нядзельная школа ў Навагрудку. Колькаць вучняў абумоўлена наяўнасцю вялікай мусульманскай абшчыны, якая пражывае ў горадзе. Тут адно з памяшканняў мячэці выдзелена пад школу, у распараджэнні якой знаходзіцца бібліятэка вучэбнай літаратуры і відэатэка ісламскіх фільмаў.

Добра арганізавана вучоба татарскай абшчыны горада Маладзечна. З 2000 года тут пачаліся заняткі ў нядзельнай школе, якую на той момант наведвалі 12 чалавек ва ўзросце ад 12 да 65 гадоў. Акрамя вывучэння стаўпоў ісламу, у школе значная ўвага надаецца аваладанню тэхнікі чытання па–арабску.

Муфціят Беларусі рэгулярна наведвае, асабліва ў канцы навучальнага года, нядзельныя мусульманскія школы. Падчас такіх паездак правяраюцца веды навучэнцаў, уручаюцца падарункі самым старанным вучням [6, с. 48].

З мэтай павелічэння цікавасці да ісламскай веры сярод моладзі і паглыблення ведаў аб мусульманскай рэлігіі выкарыстоўваюцца і іншыя формы і метады працы з маладым пакаленнем. Жаданую эфектыўнасць даюць летнія лагеры (мухайемы) для мусульманскіх дзяцей. Упершыню іх пачалі арганізоўваць ў 1994 годзе. Функцыянуюць лагеры невялікі тэрмін, часам толькі на працягу тыдня, але ў гэты час праца атрымоўваецца вельмі плённай і выніковай. Разам з правядзеннем розных аздараўленчых мерапрыемстваў вялікая ўвага ў такіх лагерах надаецца ісламскаму выхаванню юнакоў і дзяўчат: тлумачацца асновы мусульманскай рэлігіі, ідзе навучанне правільнаму выкананню абмывання, намаза, праводзяцца ўрокі ісламскай духоўнасці, што спрыяе асэнсаванаму далучэнню моладзі да традыцыйнай веры сваіх продкаў. У летнія лагеры для правядзення заняткаў часта запрашаюць студэнтаў і аспірантаў з мусульманскіх краін, якія вучацца ў Беларусі. З іх дапамогай дзеці аваладваюць арабскім алфавітам, знаёмяцца з Кур'анам, вучаць самыя распаўсюджаныя сярод мусульман малітвы [6, с. 49].

Такім чынам, відавочна, што беларускія татары–мусульмане з даўніх часоў ажыццяўляюць сваю традыцыйную адукацыю, хаця і з рознай эфектыўнасцю ў тыя ці іншыя часы. Ні ў адной канфесіі няма перспектыў, калі ў сваёй дзейнасці яна не звяртае належнай увагі на малодшае пакаленне. Таму цалкам апраўданым з'яўляецца тое, што кіраўнікі татарска–мусульманскай абшчыны Беларусі на сучасным этапе вялікае значэнне надаюць працы з дзецьмі. Толькі пры ўмове, што дзеці працягнуць справу бацькоў, татарская абшчына, нягледзячы на сваю нешматлікасць, зможа існаваць і паспяхова развівацца ў дамінуючым хрысціянскім асяроддзі.

Спісак цытаваных крыніц

1. Грыцкевіч, А. Фарміраванне татарскай народнасці на Беларусі / А. Грыцкевіч // Татары–мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы:



Репозиторий БрГТУ

матэрыялы Першай міжнар. навук.–практ. канф., прысвеч. да 600–годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска–Літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім, Мінск, 26–27 сак. 1993 г.: у 3 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун–т; рэдкал.: І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1994. – Ч. 1. – С. 14–24.
2. Думін, С.У. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць / С.У. Думін, І.Б. Канапацкі – Мінск: Полымя, 1993. – 206 с.
3. Туфкрэа, Р.А. Беларускія татары: далучэнне дзяцей да гісторыі і культуры свайго этнасу / Р.А. Туфкрэа // Адукацыя і выхаванне / М–ва адукацыі і навукі Рэсп. Беларусь, Нац. ін–т адукацыі, Калектыў рэд. часоп. – Мінск, 2009. – № 10. – С. 69–73.
4. Канапацкі, І.Б. З гісторыі мусульманскай адукацыі татарскай дыяспары на Беларусі / І.Б. Канапацкі, А.–Б. Шабановіч // Нацыянальная адукацыя. Адукацыя дыяспар: тэматычны зб. навук. прац. / Міжнар. акад. вывучэння нац. меншасцей; навук. рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст, 1998. – Кн. IX. – С. 10–14.
5. Іслам і мусульмане Беларусі ў XX стагоддзі / Пад рэд. І. Канапацкага [і інш.] – Мінск, 2002. – 156 с.
6. Лыч, Л.М. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна–палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.) / Л.М. Лыч. – Мінск: Кнігазбор, 2007. – 76 с.

## ХРЫСЦІЯНСКІЯ ЦЭННАСЦІ І АСАБЛІВАСЦІ САЦЫЯЛЬНА–ЭКНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ПРЫГРАНІЧНЫХ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ Ў XIV–XVI стст. ( НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕРАСЦЯ )

Галімава Н.П.,
к.ф.н., доцент, БрГУ им. А.С. Пушкина

Далучэнне Берасцейскай зямлі да ВКЛ адбылося ў 1319 г. пры князю Гедзіміне, які атрымаў уладу ў 1315 г. У 1366 г. паводле дагавору паміж літоўскімі князямі Кейстутам, Еўнуцьем і Любартам і польскім каралём Казімірам адбыўся падзел зямель, паводле якога Львоўская зямля адышла да Польшчы, а Уладзімірская, Луцкая, Бельская, Холмская і Берасцейская ўвайшлі ў склад ВКЛ.

У канцы XIV ст. Берасце стала важным гандлёва–прамысловым прыгранічным цэнтрам ў ВКЛ. 15 жніўня 1390 г. Ягайла дараваў гораду прывілей на гарадское самакіраванне паводле магдэбурскага права. Берасце быў пасля Вільні другім горадам, які атрымаў права на самакіраванне. Кіраванне горадам перайшло да рады, што складалася з лаўнікаў (засядацеляў), радцаў (дарадчыкаў) і 2 бурмістраў. Галоўным ў горадзе быў войт, які назначаўся князем ВКЛ. Ён узначальваў і суд, які разглядаў крымінальныя справы.

Жыхары Берасця, якія не падпарадкоўваліся асобным феадалам, знаходзіліся пад юрысдыкцыяй гарадской рады і абкладваліся падаткам. Астатнія жыхары падпарадкоўваліся сваім ранейшым феадалам, а не радзе. Увесь цяжар падаткаў ляжаў на працоўных.

У канцы XIV – пачатку XV стст. у Берасці налічвалася каля 2 тыс. жыхароў. У 1390 г. у горадзе быў пабудаваны першы гасцінны двор, прахо-



Репозиторий БрГТУ